ПРАВААБАРОНЦЫ
ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

# Выбары*2025. Аналітычная справаздача па выніках назірання за вылучэннем і рэгістрацыяй кандыдатаў

*Экспертная місія па назіранні за выбарамі*2025[1] арганізаваная Беларускім Хельсінкскім Камітэтам і ПЦ "Вясна" ў межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары". Місія збірае і аналізуе інфармацыю аб выбарчай кампаніі паводле адкрытых крыніц і паведамленняў ад выбаршчыкаў з Беларусі.*

## ВЫСНОВЫ

- Захоўваецца рэпрэсіўная атмасфера пагроз, нагнятання страху, ціску і рэпрэсій у сувязі з любой несанкцыянаванай уладамі грамадзянскай актыўнасцю. "Прафілактычныя гутаркі", паўторныя затрыманні людзей, што паказалі актыўнасць у перыяд папярэдняй прэзідэнцкай кампаніі 2020 года, спалучаюцца з дэманстрацыяй гатоўнасці жорстка здушыць любыя праявы нелаяльнасці ў гэтай выбарчай кампаніі. Гэткая атмасфера страху негатыўна ўплывае на шанцы "здаровых" паводзін выбаршчыкаў, што бачаць рэпрэсіўныя наступствы подпісаў за альтэрнатыўных Аляксандру Лукашэнку кандыдатаў у 2020 годзе і не хочуць рызыкаваць, ставіць подпісы за кагосьці ў 2024;
- Заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў[2] у прэзідэнты падалі 11 чалавек (у 2020 г. — 55). ЦВК адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп Дзіяны Кавалёвай (у сувязі з недастатковай колькасцю сябраў ініцыятыўнай групы), Аляксандра Драздова і Віктара Куляша (у сувязі з невыкананнем патрабаванняў па спісе сябраў ініцыятыўнай групы), Юрыя Губарэвіча (у сувязі з накіраваннем дакументаў па электроннай пошце, што не прадугледжана выбарчым заканадаўствам).

[1] "Выбары*" у дачыненні да выбарчай кампаніі-2025 выкарыстоўваецца кампаніяй "Праваабаронцы за свабодныя выбары" з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, паколькі любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі напоўніцу рэалізуюцца правы і свабоды, уключна з свабодай слова, свабодай мірных сходаў і асацыяцый, правам удзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабодай ад дыскрымінацыі, што ў цяперашні час у Беларусі практычна адсутнічае.
[2] "Кандыдат" ды іншыя назоўнікі марфалагічнага мужчынскага роду выкарыстоўваюцца ў значэнні агульнага роду і абазначаюць усе гендары.

- ЦВК зарэгістравала 7 ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты — Аляксандра Лукашэнку (дзеючага прэзідэнта), Алега Гайдукевіча (старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі), Аляксандра Хіжняка (старшыні Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці), Вольгі Чамаданавай (начальніцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы і па справах моладзі Мінгарвыканкама), Ганны Канапацкай (індывідуальнай прадпрымальніцы), Сяргея Бобрыкава (старшыні Рэспубліканскага савета грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз афіцэраў"), Сяргея Сыранкова (першага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі). Пазней было абвешчана, што В. Чамаданава і С. Бобрыкаў падалі заявы аб спыненні працы сваіх ініцыятыўных груп. Ніхто з гэтых кандыдатаў не вылучыўся як відавочная альтэрнатыва А. Лукашэнку, хутчэй за ўсе яны запланаваныя як "спарынг-партнёры", што мусяць забяспечыць фармальную альтэрнатыўнасць у бюлетэні.
- Мясцовыя органы крыху пашырылі пералік месцаў, дзе забаронена пікетаванне па зборы подпісаў выбаршчыкаў за вылучэнне кандыдатаў у прэзідэнты, пры гэтым назіралася некаторая разнастайнасць у трактоўках Выбарчага кодэкса. Аднак з улікам фактычнай безальтэрнатыўнасці выбараў і нізкай актыўнасці выбаршчыкаў, такое скарачэнне месцаў для пікетавання не выклікала рэакцыі кандыдатаў: ніякія ініцыятыўныя групы не скардзіліся на праблемы па зборы подпісаў.
- Захаванне ў заканадаўстве дазволу збіраць подпісы на тэрыторыях прадпрыемстваў і ўстаноў ўмацавала механізм адміністрацыйна-каманднага прымусу да падпісання ў падтрымку А. Лукашэнкі і ў некаторых выпадках паралельна А. Хіжняка і, верагодна, іншых "спарынг-партнёраў". Зборшчыкі подпісаў часта не прад'яўлялі дакументы, інфармацыя для падпісных лістоў падавалася аддзеламі кадраў бюджэтных устаноў і дзяржаўных прадпрыемстваў.
- Такім чынам, збор подпісаў прайшоў з сур'ёзнымі парушэннямі стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, у атмасферы запалохвання і прымусу. Дэ-факта ўлады рабілі актыўныя дзеянні па папярэджанні любой патэнцыйнай не санкцыянаванай "зверху" грамадзянскай актыўнасці. Працэс збору подпісаў выключаў роўнасць кандыдатаў і быў накіраваны на забеспячэнне карцінкі падтрымкі толькі аднаго кандыдата, А. Лукашэнкі, з традыцыйным выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу і прымусу выбаршчыкаў да падпісання за яго вылучэнне кандыдатам. Гэты этап з'яўляецца самым празрыстым для выканаўчай вертыкалі, калі ўсе прастаўленыя подпісы і адмова іх прaставіць могуць стаць падставай для палітычна-матываванага праследу.
- Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі пацвердзілі збор неабходных 100 тысяч подпісаў усімі пяццю прэтэндэнтамі. Праверка подпісаў, як і раней,

адбывалася непразрыста і ў вельмі сціснутыя тэрміны, што выклікае абгрунтаваныя сумневы ў праўдзівасці агучаных лічбаў.

- Часткай фактычна агітацыйнай кампаніі, закліканай легітымаваць ідэю шырокай падтрымкі выбаршчыкамі А. Лукашэнкі ўжо на гэтым этапе, з'яўляецца рэкордна высокая колькасць заяўленых подпісаў і розніца паміж нібыта сабранымі подпісамі ў яго падтрымку (больш за 2,5 млн. подпісаў, каля 35% усіх выбаршчыкаў) і подпісамі, сабранымі іншымі кандыдатамі (у межах 112-134 тысячы). Асаблівая роля была адведзена дзяржаўным і праўладным медыя-рэсурсам, асабліва раённым газетам, якія факусаваліся на фактычнай агітацыі за А. Лукашэнку.
- ЦВК зарэгістраваў кандыдатамі і выдаў пасведчанні аб рэгістрацыі 5 прэтэндэнтам: Алегу Гайдукевічу, Ганне Канапацкай, Аляксандру Лукашэнку, Сяргею Сыранкову, Аляксандру Хіжняку на наступны ж дзень пасля пачатку этапу рэгістрацыі, і гэта самая хуткая рэгістрацыя за гісторыю правядзення прэзідэнцкіх выбараў.

## I. ПРАВАВАЯ БАЗА

Вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў рэгулююцца артыкулам 15 Выбарчага кодэкса і ўдакладняюцца пастановай ЦВК №70[3].

### *Вылучэнне кандыдатаў*

Вылучэнне кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца шляхам збору подпісаў не менш за 100 тысяч выбаршчыкаў. Збор подпісаў праводзіцца ініцыятыўнай групай выбаршчыкаў у колькасці не менш за 100 чалавек; ініцыятыўная група павінна быць зарэгістраваная ЦВК. Артыкул 61 Выбарчага кодэкса вызначае патрабаванні да дакументаў, што мусяць быць пададзеныя для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, і дакументаў, якія мусіць прад'явіць асоба, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у прэзідэнты. Важна яшчэ раз звярнуць увагу на ўведзеныя "канстытуцыйнай рэформай" змены патрабаванняў, што прад'яўляюцца, у прыватнасці, да кандыдатаў у прэзідэнты:

- павышаны ўзроставы цэнз: кандыдат павінен быць "не маладзейшы за 40 гадоў" замест 35;
- павышаны цэнз аселасці: патрабуецца пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь *не менш за 20 гадоў непасрэдна перад выбарамі* замест дзесяці гадоў у папярэдняй рэдакцыі нормы;

[3] Пастанова ЦВК Рэспублікі Беларусь ад 24 кастрычніка 2024 г. № 70: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post70-2025.pdf

- прэзідэнтам не можа быць абраны грамадзянін, які мае або які меў раней грамадзянства замежнай дзяржавы альбо від на жыхарства ці іншы дакумент замежнай дзяржавы, які дае права на льготы ды іншыя перавагі.[4]

Дакументы могуць быць пададзеныя ў ЦВК як асабіста грамадзянінам, што мае намер вылучыцца кандыдатам у прэзідэнты, так і яго прадстаўніком на падставе завеwell даверанасці. У межах гэтай кампаніі дакументы для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы павінны быць пададзеныя ў ЦВК не пазней за 1 лістапада 2024 г.

ЦВК разглядае заяву ў пяцідзённы тэрмін з дня яе паступлення, рэгіструе ініцыятыўную групу і выдае сябрам ініцыятыўнай групы пасведчанні і падпісныя аркушы для збору подпісаў выбаршчыкаў. ЦВК можа адмовіць у рэгістрацыі ініцыятыўнай групы ў выпадку парушэння выбарчага кодэкса; акрамя таго, ЦВК мае права адмяніць рашэнне аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы без папярэдняга папярэджання ў выпадку паўторнага парушэння яе сябрамі патрабаванняў Выбарчага кодэкса, калі раней ужо было вынесенае папярэджанне.

Адмова ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, адмена рашэння аб яе рэгістрацыі могуць быць абскарджаны ў трохдзённы тэрмін з дня прыняцця адпаведнага рашэння ў Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Скарга разглядаецца ў трохдзённы тэрмін. Рашэнне аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы таксама можа быць адмененае на падставе заявы асобы, што вылучаецца кандыдатам у прэзідэнты.

### *Збор подпісаў*

Збор подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, прапанаваных для вылучэння кандыдатамі ў прэзідэнты, у рамках аналізаванай кампаніі праводзіўся з 7 лістапада 2024 г. па 6 снежня 2024 г. уключна. Сябра ініцыятыўнай групы пры зборы подпісаў выбаршчыкаў павінен прад'яўляць выбаршчыкам выдадзенае ЦВК пасведчанне і дакумент з фотаздымкам, які пацвярджае асобу. Подпісы ў падпісных аркушах маюць права ставіць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, што дасягнулі 18 гадоў, якія валодаюць выбарчым правам.

У падпісным лісце павінны быць подпісы выбаршчыкаў, якія пражываюць на тэрыторыі толькі аднаго раёна, горада абласнога падпарадкавання без раённага дзялення, а ў гарадах з раённым дзяленнем — аднаго раёна ў горадзе. Выбаршчык мае права паставіць подпіс у падтрымку некалькіх кандыдатур, прапанаваных для вылучэння кандыдатамі ў прэзідэнты — але толькі адзін раз у падтрымку адной і той

[4] Гл. артыкул 57 Выбарчага кодэкса ў рэдакцыі Закона ад 16.02.2023 № 252-З.

жа кандыдатуры. Выбаршчыкі маюць права зняць свае подпісы да здачы падпісных лістоў у адпаведную камісію з дапамогай звароту да апошняй з заявай.

Збор подпісаў можа ажыццяўляцца ў форме пікетавання. Атрыманне дазволу на правядзенне пікетавання для гэтых мэтаў не патрабуецца, калі яно праводзіцца ў месцах, не забароненых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. *Удзел адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў, роўна як і прымус у працэсе збору подпісаў і ўзнагароджанне выбаршчыкаў за ўнясенне подпісу, не дапускаюцца.* Парушэнне гэтых патрабаванняў можа быць падставай для адмовы ў рэгістрацыі або адмены рашэння аб рэгістрацыі кандыдата ў прэзідэнты.

### *Рэгістрацыя кандыдатаў*

У межах гэтай кампаніі, у адпаведнасці з патрабаваннямі Выбарчага кодэкса і складзенага ЦВК каляндарнага плана, рэгістрацыя кандыдатаў павінна была ажыццяўляцца з 22 па 31 снежня 2024 г. уключна. Артыкул 68 Выбарчага кодэкса змяшчае, сярод іншага, патрабаванні да дакументаў, якія патэнцыйнаму кандыдату неабходна падаць у ЦВК да пачатку рэгістрацыі, сярод іх — дэкларацыя аб даходах і маёмасці асобы, што вылучаная кандыдатам, яго жонкі (мужа) і паўналетніх блізкіх сваякоў, якія сумесна з ім пражываюць і вядуць агульную гаспадарку, а таксама фінансавую справаздачу аб расходаванні сродкаў выбарчага фонду.

ЦВК правярае адпаведнасць парадку вылучэння кандыдатаў патрабаванням Выбарчага кодэкса і дакладнасць звестак у прадстаўленых для рэгістрацыі дакументах. Асоба, вылучаная кандыдатам у прэзідэнты, мае права знаёміцца з матэрыяламі праверкі.

Рашэнне аб рэгістрацыі кандыдата прымаецца, сярод іншага, пры наяўнасці пратаколаў абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах прэзідэнта, якія пацвярджаюць наяўнасць не менш за 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Артыкул 68-1 Выбарчага кодэкса вызначае, сярод іншых, наступныя *падставы для адмовы* ў рэгістрацыі кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь:

- неадпаведнасць асобы, што вылучаная кандыдатам, патрабаванням, якія прад'яўляюцца Кодэксам, да кандыдата;
- наяўнасць абвінаваўчага прысуду, што набыў моц, у дачыненні да асобы, вылучанай кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;
- невыкананне патрабаванняў, прадугледжаных Выбарчым кодэксам, да вылучэння кандыдата;
- непрадстаўленне аднаго або некалькіх дакументаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдата;

- недастатковая для рэгістрацыі кандыдата колькасць дакладных подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку гэтага кандыдата;
- выкарыстанне ў інтарэсах абрання грашовых сродкаў або іншай матэрыяльнай дапамогі замежных дзяржаў і арганізацый, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, міжнародных арганізацый, арганізацый, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства;
- наяўнасць у падпісных лістах больш за 15 працэнтаў недакладных подпісаў ад агульнай колькасці правераных подпісаў выбаршчыкаў;

ЦВК *мае права адмовіць* у рэгістрацыі кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты ў выпадку:

- прадстаўлення ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці асобы, вылучанай кандыдатам у прэзідэнты, звестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасці ды маюць істотны характар;
- выкарыстання пераваг службовага становішча ў інтарэсах абрання;
- удзелу адміністрацыі арганізацыі ў зборы подпісаў выбаршчыкаў, прымусу ў працэсе збору подпісаў і ўзнагароджання выбаршчыкаў за ўнясенне подпісу;
- перавышэння асобай, вылучанай кандыдатам у прэзідэнты, больш чым на 20 працэнтаў гранічнага памеру расходавання сродкаў выбарчага фонду;
- паўторнага парушэння асобай, якая вылучаецца кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, або ініцыятыўнай групай патрабаванняў Выбарчага кодэкса ды іншых актаў заканадаўства аб выбарах, калі раней ім было вынесена папярэджанне.

Рашэнне ЦВК аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатам у прэзідэнты можа быць абскарджана асобай, вылучанай кандыдатам, у Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця рашэння. Вярхоўны суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з'яўляецца канчатковым.

Выбарчае заканадаўства фармальна падзяляе этапы збору подпісаў і агітацыі: у адпаведнасці з артыкулам 45 Выбарчага кодэкса: "передвыбарная агітацыя кандыдата <...> пачынаецца за 25 дзён да выбараў". Такім чынам, агітацыйныя мерапрыемствы могуць стартаваць толькі з 1 студзеня 2025 г.

## II. РЭГІСТРАЦЫЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ ГРУП

У самыя кароткія магчымыя тэрміны, 24 кастрычніка 2024 года была абвешчаная дата выбараў*. Адпаведна, не пазней за 1 лістапада 2024 г.[5] мусілі быць пададзеныя дакументы для рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты (далей – ініцыятыўныя групы). 25 кастрычніка прэс-служба ЦВК абвясціла,[6] што прыём дакументаў ажыццяўляецца з 24 кастрычніка па 1 лістапада. Такія тэрміны робяць практычна немагчымай натуральную палітычную актыўнасць рэальных палітычных суб'ектаў, асабліва з улікам таго, што чаканая, згодна з канстытуцыйнымі тэрмінамі кадэнцый дата выбараў, мусіла прыпасці на лета 2025 года.

Тым не менш паводле паведамленняў ЦВК, дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп падалі:

26 кастрычніка (праз дзень пасля абвяшчэння выбараў*) – дэ-факта прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка;[7]

30 кастрычніка – начальніца галоўнага ўпраўлення Мінгарвыканкама, былая прэс-сакратарка МУС Вольга Чамаданава;[8] старшыня Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці Аляксандр Хіжняк;[9] старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алег Гайдукевіч;[10]

31 кастрычніка – першы сакратар Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Сяргей Сыранкоў,[11] Дзіяна Кавалёва,[12] старшыня Рэспубліканскага савета грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз афіцэраў" Сяргей Бобрыкаў,[13] дэпутатка Палаты Прадстаўнікоў пятага склікання і кандыдатка ў прэзідэнты 2020 года Ганна Канапацкая;[14]

1 лістапада – Віктар Кулеш.[15]

Пры гэтым, патэнцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты альбо з'яўляюцца прадстаўнікамі трох з чатырох пакінутых пасля перарэгістрацыі 2023 года праўладных партый, якія не маюць рэальнага ўплыву ў грамадска-палітычным жыцці краіны, альбо наогул не маюць хоць якога публічнага бэкграўнду, як Аляксандр Драздоў і Віктар Кулеш, пра якіх на момант рэгістрацыі ініцыятыўнай групы не было ніякай публічнай інфармацыі,[16]

---

[5] ЦВК, каляндарны план арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 26 студзеня 2025 г.: .https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/kalendar2025.pdf
[6] https://t.me/cikbelarus/2805
[7] https://t.me/cikbelarus/2810
[8] https://t.me/cikbelarus/2830
[9] https://t.me/cikbelarus/2828
[10] https://t.me/cikbelarus/2827
[11] https://t.me/cikbelarus/2837
[12] https://t.me/cikbelarus/2834
[13] https://t.me/cikbelarus/2833
[14] https://t.me/cikbelarus/2832
[15] https://t.me/cikbelarus/2841
[16] Belsat, *7 «кандидатов в кандидаты» в президенты. Кто они?*, 31.10.2024, https://ru.belsat.eu/83266068/7-kandidatov-v-kandidaty-v-prezidenty-kto-oni

або Дзіяна Кавалёва, першая публічная інфармацыя пра якую з'явілася ў дзень падачы дакументаў аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы з кароткім апісаннем кандыдаткі "Магілёўская прадпрымальніца".[17]

Таксама, мяркуючы па рашэннях аб адмове ў рэгістрацыі,[18] дакументы падаў Аляксандр Драздоў і Юрый Губарэві – які знаходзіцца ў вымушанай эміграцыі ў сувязі з палітычна матываваным пераследам,[19] кіраўнік пазбаўленага рэгістрацыі ў Беларусі палітычнага грамадскага аб'яднання Рух "За Свабоду!".

Ужо 29 кастрычніка прэс-служба ЦВК паведаміла аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы Аляксандра Лукашэнкі.[20] 31 кастрычніка,[21] г. зн. на наступны дзень пасля падачы дакументаў, – аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп Алега Гайдукевіча, Аляксандра Хіжняка і Вольгі Чамаданавай. 4 лістапада[22] – аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп Ганны Канапацкай, Сяргея Бобрыкава і Сяргея Сыранкова.

Пастанова аб адмове ў рэгістрацыі была прынятая[23] ў дачыненні да трох патэнцыйных кандыдатаў без публічнага бэкграўнду: Віктара Кулеша, бо была пададзеная толькі заява без спісу сябраў ініцыятыўнай групы,[24] Дзіяны Кавалёвай, у сувязі з недастатковай колькасцю сябраў ініцыятыўнай групы,[25] і Аляксандра Драздова, у сувязі з непрадстаўленнем спісу сябраў ініцыятыўнай групы[26] – г. зн. за невыкананне простых фармальных патрабаванняў да пакета дакументаў, што падаюцца. А таксама ў дачыненні да Юрыя Губарэвіча – у сувязі з накіраваннем дакументаў па электроннай пошце, што не прадугледжана выбарчым заканадаўствам.[27]

Паводле паведамлення ЦВК, Вольга Чамаданава і Сяргей Бобрыкаў падалі заявы аб спыненні працы сваіх ініцыятыўных груп[28] – абое

[17] БелТА, *ЦИК отказал в регистрации инициативной группе Дианы Ковалевой для выдвижения кандидатом в Президенты*, 04.11.2024, https://belta.by/society/view/tsik-otkazal-v-registratsii-initsiativnoj-gruppe-diany-kovalevoj-dlja-vydvizhenija-kandidatom-v-673181-2024/
[18] https://t.me/cikbelarus/2817?single
[19] Вясна, *"Справа Каардынацыйнай рады" — новы напад на грамадзянскую супольнасць Беларусі*, 04.12.2023, https://spring96.org/be/news/113478
[20] https://t.me/cikbelarus/2817
[21] https://t.me/cikbelarus/2836
[22] https://t.me/cikbelarus/2845
[23] https://t.me/cikbelarus/2845, https://t.me/cikbelarus/2817?single
[24] БелТА, *ЦИК отказал в регистрации инициативной группе Виктора Кулеша для выдвижения кандидатом в Президенты,* 04.11.2024, https://belta.by/society/view/tsik-otkazal-v-registratsii-initsiativnoj-gruppe-viktora-kulesha-dlja-vydvizhenija-kandidatom-v-673182-2024/
[25] БелТА, *ЦИК отказал в регистрации инициативной группе Дианы Ковалевой для выдвижения кандидатом в Президенты*, 04.11.2024, https://belta.by/society/view/tsik-otkazal-v-registratsii-initsiativnoj-gruppe-diany-kovalevoj-dlja-vydvizhenija-kandidatom-v-673181-2024/
[26] БелТА, *"Несерьезность намерений". ЦИК объяснил причину отказа в регистрации двух инициативных групп*, 29.10.2024, https://belta.by/society/view/neserjeznost-namerenij-tsik-objjasnil-prichinu-otkaza-v-registratsii-dvuh-initsiativnyh-grupp-671767-2024/
[27] Там жа.
[28] https://t.me/cikbelarus/2883

выказваючы падтрымку[29] дэ-факта прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку, пры гэтым пастановы аб рэгістрацыі іх ініцыятыўных груп на сайце ЦВК адсутнічаюць.[30]

Такім чынам, з 7 зарэгістраваных, працу працягнулі 5 ініцыятыўных груп. Ніхто з гэтых кандыдатаў не вылучыўся як відавочная альтэрнатыва А. Лукашэнку, хутчэй за ўсе яны запланаваныя як "спарынг-партнёры", што мусяць забяспечыць фармальную альтэрнатыўнасць у бюлетэні.

## III. ЗБОР ПОДПІСАЎ

Этап збору подпісаў праходзіў з 7 лістапада па 6 снежня 2024 г.[31] Зарэгістраваным ініцыятыўным групам неабходна было сабраць не менш за 100 тысяч подпісаў.[32]

Па 4 лістапада мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады вызначылі месцы, забароненыя для правядзення пікетавання з мэтай збору подпісаў выбаршчыкаў. Сярод іх найбольш праходныя, папулярныя і значныя месцы – цэнтральныя плошчы гарадоў, галоўныя вуліцы, месцы пасадкі і высадкі пасажыраў на прыпыначных пунктах грамадскага транспарту, аўтамабільныя стаянкі і паркоўкі. Забаронена збіраць подпісы паблізу рэзідэнцыі прэзідэнта, будынкаў і збудаванняў, у якіх размешчаны арганізацыі, што выконваюць функцыі рэдакцый СМІ, а таксама радыётэлевізійныя перадаючыя і радыёперадаючыя станцыі – не бліжэй, чым 200 метраў; школ, універсітэтаў, лякарняў, будынкаў дзяржаўных органаў – не бліжэй, чым 50 метраў.[33]

У той жа час, візуальна на вуліцах населеных пунктаў краіны адпаведнай колькасці сабраных подпісаў актыўнасці заўважана не было, што пацвярджаецца і данымі незалежных крыніц інфармацыі.[34] Карціна ўсенароднай падтрымкі аднаго кандыдата – А. Лукашэнкі, якую паказвалі

---

[29] БелТА, *Ольга Чемоданова больше не участвует в электоральной кампании по выборам Президента*, 12.11.2024, https://belta.by/society/view/olga-chemodanova-bolshe-ne-uchastvuet-v-elektoralnoj-kampanii-po-vyboram-prezidenta-674853-2024/
«Мы понимаем прекрасно, что никто кроме нашего Президента Александра Григорьевича Лукашенко сегодня не сможет обеспечить ту безопасность, в которой мы находимся».
БелТА, *Сергей Бобриков принял решение прекратить участие в электоральной кампании по выборам Президента*, 12.11.2024, https://belta.by/society/view/sergej-bobrikov-prinjal-reshenie-prekratit-uchastie-v-elektoralnoj-kampanii-po-vyboram-prezidenta-674794-2024/
«Чтобы обеспечить сплоченность офицерского корпуса, не допустить двояких мыслей среди военных, чтобы поддержать действующего главу государства и нашего лидера, мною было принято такое решение».

[30] ЦВК, Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь / Пастановы: https://rec.gov.by/ru/election-schedule-ru/view/elections-2025-president

[31] ЦВК, Каляндарны план: .https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/kalendar2025.pdf

[32] У адпаведнасці з арт. 60 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь

[33] Напрыклад, гл. дадатак да рашэння Мінгарвыканкама 31.10.2024 № 158: https://minsk.gov.by/ru/freepage/other/vybory_2025/perechen_mest_zapreshenih_dlya_sbora_podpisei.pdf

[34] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *"Усё праходзіць ціха і непрыкметна", — пра электаральную кампанію ў Маладзечне, Вілейцы, Валожыне, Мядзелі*, 05.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116875

дзяржаўныя і праўладныя медыя, мяркуючы па паведамленнях аб прымусе, часта была зымітаваная прыцягненнем груп студэнтаў, працоўных калектываў бюджэтных устаноў і дзяржаўных прадпрыемстваў.

Значная роля на этапе збору подпісаў была адведзеная дзяржаўным і праўладным медыя, а ў асаблівасці – раённым газетам. Нярэдка асвятленне збору подпісаў зводзілася[35] да публікацыі каментароў выбаршчыкаў са станоўчай ацэнкай пераважна кандыдата А. Лукашэнкі або размяшчэннем ілюстрацыі са слоганам яго выбарчай кампаніі ("Надо!"),[36] у той час як іншыя кандыдаты практычна не згадваліся.[37] Лаяльныя да ўлады журналісты факусаваліся на тым, каб паказаць масавасць на пікетах па зборы подпісаў і ўсенародную падтрымку кандыдата А. Лукашэнкі,[38] што з'яўляецца формай агітацыі, фармальна не дазволенай на гэтым этапе выбарчай кампаніі.

Разам з пачаткам этапу збору подпісаў прадстаўнікі ўлады, адміністрацыі ўстаноў і прадпрыемстваў і дзяржаўна-залежныя грамадскія структуры актывізаваліся ў запалохванні і пагрозах адміністрацыйным і крымінальным пакараннем за ўдзел у масавых мерапрыемствах, не санкцыянаваных уладамі. Прафілактычныя мерапрыемствы, закліканыя не дапусціць ніякай альтэрнатыўнага грамадзянскай актыўнасці, уключна з сходамі, праводзілі органы пракуратуры для работнікаў прадпрыемстваў,[39] адміністрацыі школ – для бацькоў,[40] дэпутаты і старшыні першасных арганізацый БРСМ – для студэнтаў.

Працэс збору подпісаў традыцыйна адбываўся **з выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу**. Кіраўніцтва бюджэтных арганізацый у працоўны час праводзіла сходы працоўных калектываў з прымусам

---

[35] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *Як на Берасцейшчыне прайшоў збор подпісаў на выбарах**, 06.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116892

[36] Зеркало, *Власти запустили флешмоб: работников госорганизаций и военных заставляют просить Лукашенко баллотироваться на 7-й срок,* 28.10.2024, https://news.zerkalo.io/cellar/81933.html

«Власти в Беларуси запустили флешмоб, в ходе которого различные госорганизации и госорганы публикуют видео, где сотрудники якобы просят Александра Лукашенко участвовать в президентских выборах – 2025. Ролики опубликованы в телеграм-каналах и соцсетях различных министерств и госпредприятий.

Все видео сделаны по одному сценарию: сначала показан отрывок интервью Лукашенко российской пропагандистке Ольге Скабеевой, в котором она спрашивает, будет ли он участвовать в выборах-2025, на что тот отвечает: если его сторонники скажут, что это надо. После чего люди на видео говорят “надо”».

[37] Правозащитники за свободные выборы, *"Таму што ён – народны". Як раёнка Мінскага раёна агітуе за Лукашэнку,* 05.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116866

[38] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *Пастановачныя кадры, агітацыя ў школе: як на Берасцейшчыне прайшоў збор подпісаў на выбарах*,* 06.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116892

[39] Магілёўская Вясна, *Заместитель начальника отдела по надзору за дознанием прокуратуры Могилёвской области Константин Левицкий провёл встречу с трудовым коллективом Белыничской центральной районной больницы*: https://t.me/MAYDAYMog/4663

[40] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *Бацькоў мінскіх школьнікаў перад выбарамі* пужаюць адказнасцю за ўдзел у "масавых мерапрыемствах",* 18.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116979

падпісваць за А. Лукашэнку,[41] вядомыя таксама выпадкі прымусовага збору подпісаў за вылучэнне А. Хіжняка ў кандыдаты.[42] Некаторыя дзяржаўныя медыя асвятлялі працэс збору подпісаў, адзначаючы, што ініцыятыўныя групы кандыдата А. Лукашэнкі былі запрошаныя самімі калектывамі.[43]

Пра збор подпісаў на працоўным месцы вядома, у прыватнасці, з г. Рэчыца, там збор подпісаў пачаўся на 2 дні раней установленага тэрміну, а перад кіраўніцай аднаго з рэчыцкіх прадпрыемстваў была пастаўлена норма збору: 360 подпісаў.[44] У школах Рагачова і Светлагорска зафіксаваныя выпадкі, калі выклікалі настаўнікаў да дырэктара і прымушалі паставіць подпісы ў двух спісах адначасова.[45]

Паведамляецца аб распаўсюджаных асцярогах ставіць подпісы за любых кандыдатаў акрамя А. Лукашэнкі, з улікам рэпрэсіўных наступстваў такіх подпісаў у 2020 г.

Збор подпісаў адміністрацыямі арганізацый суправаджаўся ціскам на выбаршчыкаў, у тым ліку метадам запалохвання.[46] [47] Паведамляецца, што частка пікетаў па зборы подпісаў за А. Лукашэнку праходзіла ў суправаджэнні супрацоўнікаў міліцыі. Гэты этап з'яўляецца самым празрыстым для выканаўчай вертыкалі, калі ўсе пададзеныя подпісы і адмова іх праставіць могуць стаць падставай для палітычна-матываванага пераследу.

У парушэнне Выбарчага кодэкса,[48] былі заўважаныя шматлікія факты агітацыі за кандыдата А. Лукашэнку. Напрыклад, аднaчасова са зборам подпісаў у бюджэтных установах праводзіліся агітацыйныя мерапрыемствы пад выглядам абмеркавання будучых выбараў, на якіх асаблівая ўвага прысвячалася палітыцы аднаго кандыдата – А. Лукашэнкі. Такія

[41] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *"Усё праходзіць ціха і непрыкметна", — пра электаральную кампанію ў Маладзечне, Вілейцы, Валожыне, Мядзелі*, 05.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116875

[42] Вясна, *"Кто отказывается ставить подпись — вносит в список". Как проходит сбор подписей на Гомельщине*, 03.12.2024, https://spring96.org/ru/news/116836

[43] Полацкі веснік, *На Полотчине продолжается сбор подписей в поддержку выдвижения кандидатов в Президенты,* 20.11.2024, https://www.pvestnik.by/na-polotchine-prodolzhaetsya-sbor-podpisej-v-podderzhku-vydvizheniya-kandidatov-v-prezidenty/

[44] Гомельская Вясна, *У Рэчыцы раней за тэрмін пачалі збіраць подпісы за вылучэнне Лукашэнкі кандыдатам на прэзідэнта*, 06.11.2024, https://gomelspring.org/be/news/11008

[45] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *"Хто адмаўляецца ставіць подпіс — уносіць у спіс". Як праходзіць збор подпісаў на Гомельшчыне*, 03.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116833

[46] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *Без подпісу за Лукашэнку "будуць буйныя непрыемнасці". Як праходзіць збор подпісаў на Віцебшчыне,* 03.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116847

[47] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *"Выбары* 2025 — несвабодныя выбары": на беларусаў ціснуць падчас збору подпісаў,* 19.11.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116725

[48] Гл. артыкул 45 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь: перадвыбарная агітацыя кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты пачынаецца за 25 дзён да выбараў <...>

мерапрыемствы праходзілі ў школах,[49] працоўных калектывах,[50] ва ўстановах адукацыі[51] або для студэнтаў падчас пазавучэбных мерапрыемстваў, прысвечаных асобе А. Лукашэнкі.[52] Некаторыя з раённых газет[53] пры асвятленні этапу збору подпісаў таксама агітавалі за А. Лукашэнку, размяшчаючы ілюстрацыі з яго перадвыбарнай кампаніі ды абыходзячы ўвагай іншых кандыдатаў. Мясцовыя органы ўлады, асвятляючы працэс збору подпісаў, рабілі акцэнт на кампаніі А. Лукашэнкі нягледзячы на тое, што яны павінны захоўваць нейтральнасць.[54] На вуліцах, у дзяржаўных медыя распаўсюджаныя візуальныя вобразы са слоганам "Надо!", які адсылае да кампаніі А. Лукашэнкі.

Таксама формай выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу з'яўляецца інфармаванне аб колькасці сабраных подпісаў афіцыйнай прэс-службай прэзідэнта.[55]

Вядома пра мінімум адзін выпадак крымінальнага пераследу за крытыку А. Лукашэнкі як кандыдата падчас збору подпісаў. Суд Ленінскага раёна Мінска 20 снежня 2024 года прызнаў вінаватым Андрэя Куніцкага ў здзяйсненні злачынства, прадугледжанага артыкулам 368 Крымінальнага кодэкса "абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь" і прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам паўтара года ў калоніі ва ўмовах строгага рэжыму.

Этап збору подпісаў завяршыўся 6 снежня. З моманту здачы падпісных лістоў каляндарным планам адводзіцца 10 дзён на праверку дакладнасці подпісаў раённымі, гарадскімі і раённымі ў гарадах выбарчымі камісіямі. Не пазней за 16 снежня пратаколы аб устанаўленні колькасці подпісаў мусілі быць перададзены ў абласныя і Мінскую гарадскую камісіі, што цягам 5 дзён мусілі перадаць пратаколы ЦВК, але не пазней за 21 снежня.

---

[49] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *Пастановачныя кадры, агітацыя ў школе: як на Берасцейшчыне прайшоў збор подпісаў на выбарах**, 06.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116892
"У Камянцы чыноўнікі прыйшлі абмяркоўваць выбары нават у сярэднюю школу. Старшыня мясцовага раённага Савета дэпутатаў Аксана Высагроцкая распавядала школьнікам пра выбарчую кампанію і працу ініцыятыўных груп у Камянецкім раёне. Вядома, не абышлося без ухвалення палітыкі Лукашэнкі"
[50] Там жа.
"Агітацыя праводзіцца і сярод працоўных калектываў Іванаўскага раёна. Чыноўнікі розных сфер даюць справаздачу перад калектывамі, як выдатна цяпер жыць у краіне".
[51] Там жа.
"Моладзі Іванаўскага раёна падчас электаральнай кампаніі паказалі прапагандысцкі фільм "Белтэлерадыёкампаніі" "Беларусь стваральная".
[52] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *На Магілёўшчыне людзей агітуюць за Лукашэнку і палохаюць адказнасцю за "апазіцыйныя" настроі*, 05.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116874
[53] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *Пастановачныя кадры, агітацыя ў школе: як на Берасцейшчыне прайшоў збор подпісаў на выбарах**, 06.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116892
[54] Праваабаронцы за свабодныя выбары, *"Усё праходзіць ціха і непрыкметна", — пра электаральную кампанію ў Маладзечне, Вілейцы, Валожыне, Мядзелі*, 05.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116875
[55] https://t.me/pul_1/14455

23 снежня ЦВК апублікавала колькасць подпісаў,[56] пакінутых за кандыдатаў.




Заяўленая колькасць сабраных у падтрымку А. Лукашэнкі подпісаў з'яўляецца рэкорднай за ўсе 7 прэзідэнцкіх выбарчых кампаній: у 2020 г. было 1.939.572 , у 2015 г. — 1.761.145, у 2010 г. — 1.110.149, у 2006 г. — 1.905.631. Адміністрацыйны прымус дазволіў арганізаваць дэманстрацыю "падтрымкі" каля 35% выбаршчыкаў.

Такім чынам, этап збору подпісаў адбываўся ва ўмовах, у якіх сярод выбаршчыкаў адсутнічала магчымасць свабодна абмяркоўваць кандыдатаў, як і самастойна вырашаць, ці ставіць свой подпіс за вылучэнне таго ці іншага кандыдата, не асцерагаючыся пакарання. Прадстаўнікі дэ-факта ўлады рабілі актыўныя дзеянні па папярэджанні любой несанкцыянаванай "зверху" патэнцыйнай грамадзянскай актыўнасці.

Працэс збору подпісаў выключаў роўнасць кандыдатаў і быў накіраваны на забеспячэнне карцінкі падтрымкі толькі аднаго кандыдата, А. Лукашэнкі, з традыцыйным выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу і прымусу выбаршчыкаў да падпісання за яго вылучэнне кандыдатам. Пры гэтым надавалася некаторая ўвага "спарынг-партнёрам", якія павінны забяспечыць фармальную альтэрнатыўнасць у бюлетэні. Асаблівая роля

[56] https://t.me/cikbelarus/3039

была адведзена праўладным медыя, асабліва раённым газетам, якія факусаваліся фактычна на агітацыі за А. Лукашэнку.

## IV. РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ

Згодна з Каляндарным планам,[57] рэгістрацыя кандыдатаў у прэзідэнты мусіла адбыцца з 22 па 31 снежня ўключна. У двухдзённы тэрмін пасля рэгістрацыі, кандыдатам у прэзідэнты выдаюць пасведчанні аб рэгістрацыі.

23 снежня,[58] гэта значыць на наступны дзень пасля пачатку рэгістрацыі, на пасяджэнні ЦВК, усіх прэтэндэнтаў у кандыдаты зарэгістравалі і выдалі пасведчанні аб рэгістрацыі. Паводле інфармацыі, размешчанай на сайце ЦВК, гэта самая хуткая рэгістрацыя за гісторыю правядзення прэзідэнцкіх выбараў з 2006 года.[59]

---

[57] ЦВК, Каляндарны план, стр. 5 https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/kalendar2025.pdf

[58] ЦВК, Паведамленне аб рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/info-reg.pdf

[59] Інфармацыя пра перыяд рэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты да 2006 года адсутнічае. Рэгістрацыйны перыяд:

- у 2006 годзе – 12-21.02.2006 https://www.rec.gov.by/uploads/folderForLinks/archive-elections-prb2006-kalend.pdf. Регистрация – 17.02.2006 https://www.rec.gov.by/uploads/folderForLinks/archive-elections-prb2006-soob10.pdf
- у 2010 – 14-23.11.2010 https://www.rec.gov.by/uploads/folderForLinks/elections-prb-kalend-pl.pdf. Рэгістрацыя – 18.11.2010 https://www.rec.gov.by/uploads/folderForLinks/elections-prb-soob5.pdf
- у 2015 – 6-15.09.2015 https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/elections-prb2015-kalend.pdf. Рэгістрацыя – 10.09.2015 https://www.rec.gov.by/uploads/folderForLinks/elections-prb2015-soob1.pdf
- у 2020 – 5-14.07.2020 https://www.rec.gov.by/files/2020/post12.pdf. Рэгістрацыя – 14.07.2020 https://www.rec.gov.by/files/2020/inf3.pdf

## Хуткасць прыняцця рашэння аб рэгістрацыі кандыдатаў




Паводле вынікаў разгляду дакладаў старшыняў абласных і Мінскай гарадской выбарчых камісій, ЦВК вызначыў агульную колькасць подпісаў[60] выбаршчыкаў, што прызнаныя сапраўднымі. Працэс, як і раней, не быў празрыстым, адбываўся ў адсутнасць незалежных назіральнікаў і ў вельмі сціснутыя тэрміны, што выклікае абгрунтаваныя сумневы ў праўдзівасці агучаных лічбаў.

Па выніках збору подпісаў і на падставе вывучэння дакументаў, прадстаўленых усімі патэнцыяльнымі кандыдатамі: А. Гайдукевічам, А. Канапацкай, А. Лукашэнкам, С. Сыранковым, А. Хіжняком, ЦВК прыйшла да высновы, што названыя асобы адпавядаюць усім патрабаванням, і зарэгістраваў іх у якасці кандыдатаў.

## V. АБСКАРДЖАННЕ

Няма інфармацыі пра спробы абскардзіць хоць якія аспекты гэтага этапу выбарчай кампаніі.

[60]ЦВК, Звесткі аб устанаўленні колькасці выбаршчыкаў, якія паставілі подпісы ў падтрымку вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/stat13.pdf